## Заданні для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове

Выберыце правільныя адказы. Звярніце ўвагу на тое, што ў пытаннях можа быць некалькі правільных адказаў.

A1. Адзначце словы, напісанне якіх не супадае з вымаўленнем:
1. карагод;
2. касцюм;
3. мярэжка;
4. перакідваць;
5. лес і возера.

A2. Адзначце назоўнікі, у якіх пры змене формы ліку мяняецца месца націску:
1. вобад;
2. жыхар;
3. залп;
4. мора;
5. вугор.

A3. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *я*:
1. дз..лянка;
2. ..давіты;
3. усм..хацца;
4. стал..ліцейны;
5. п..даль.

A4. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *а*:
1. гл..ток;
2. мн..гаводны;
3. м..цнасалёны;
4. р..левы;
5. аб..вязкова.

A5. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *і*:
1. вы..граць;
2. між..нстытуцкі;
3. спад..лба;
4. пра..гравальнік;
5. не..стотны.

A6. Адзначце прыклады, у якіх пішацца літара *у (складовае)*:
1. паза..рочны;
2. пабег .. лес;
3. на сімпозі..ме;
4. Тамара ..ладзіміраўна;
5. працаваць па-..дарнаму.

A7. Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак:
1. кон..скі;
2. шмат..ярусны;
3. рэдз..ка;
4. людз..мі;
5. Вікенц..еў.

A8. Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):
1. Аўдоцця;
2. безуладдзе;
3. абмежаванны;
4. молью;
5. раслаенне.

A9. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:

1. закваска;
2. вучоба;
3. весела;
4. засмучанасць;
5. падземны.

A10. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:

1. акруга;
2. шаль;
3. сабака;
4. шынель;
5. завязь.

A11. Адзначце словы, якія пішуцца разам:

1. (паў) яблыка;
2. (навукова) даследчы;
3. (кіна) фестываль;
4. (прэс) сакратар;
5. (прырода) знаўчы.

A12. Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі – прымыканне:

1. нябёсы блакітныя;
2. беглі не аглядваючыся;
3. нікому не пісаць;
4. жаданне вучыцца;
5. цудоўны настрой.

A13. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:

1. чыстае паветра;
2. дваццаць чатыры;
3. шпарка ісці;
4. снягі і завеі;
5. прыляцелі ластаўкі.

A14. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх сінтаксічнай роляй. Адзначце нумар правільнага адказу.

| | |
|---|---|
| А. Усё мілагучна для слыху майго: і звонкае "*дзе*" і густое "*чаго*". | 1. Дзейнік. |
| Б. Павевам *сваім* чаруе нас светлае ранне. | 2. Выказнік. |
| В. Калодзеж быў неглыбокі, дагледжаны, *з пясчаным дном*. | 3. Азначэнне. |
| Г. Неўзабаве ўбачыў ускрай паляны з некалькімі паваленымі *асінамі*. | 4. Акалічнасць. |
| | 5. Дапаўненне. |

1) А1Б3В2Г5; 2) А5Б3В4Г4; 3) А4Б3В5Г1; 4) А4Б2В5Г1; 5) А1Б3В5Г4.

A15. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі.

1) Зашчыміць сэрца, а неўтаймоўная сіла прывязанасці да роднай зямлі цягне туды, дзе ты пачынаўся_ як істота, як чалавек, як асоба.

2) Быццам у адказ на яго словы ў паветры з'явіўся чысты_ як струна_ гук і звонка рассыпаўся ў ранішняй цішыні.

3) Вось ён стаіць перада мной і круціцца_ як вуж.

4) Зоры на ўсходнім баку неба не былі ўжо такія зыркія_ як раней.

5) Хмара_ нібы расшчапілася маланкай.

A16. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць працяжнік.

1) Дождж _ гэта ўраджай, хлеб на стале.
2) Прастора і час _ усеагульныя формы каардынацыі з'яў і падзей.
3) Слова _ не верабей, выпусціш – не зловіш.
4) Пяць і дзевяць _ чатырнаццаць.
5) Хлопец, відаць, _ добры памочнік.

A17. Адзначце абагульнена-асабовыя сказы.

1) Зробім перапынак на трыццаць хвілін.
2) Коўзкі тоненькі лядок.

3) Абяцанага тры гады чакаюць.
4) За песні і весялосць празвалі Васіліну ў вёсцы вяснянкай.
5) Ліхтаром пушчы не асвеціш.

A18. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

А) Пераліванне з пустога ў парожняе
Б) Як у ваду глядзеў
В) З глыбіні душы
Г) Губляць грунт пад нагамі

1. Угадаў, прадбачыў што-небудзь
2. Пазбаўляцца ўсякай упэўненасці ў сабе
3. Марная трата часу, бескарысны занятак
4. Перабудоўваць што-небудзь пэўным чынам
5. Чыстасардэчна, з найлепшымі намерамі

1) А5Б3В2Г1; 2) А3Б1В5Г2; 3) А2Б4В1Г5; 4) А3Б2В1Г4; 5) А4Б1В2Г3.

A19. Вызначце антонімы.

1) *Надраць бульбы – надраць паперы.*
2) Маўклівая згода – гаваркая жанчына.
3) Густы авёс – рэдкі кісель.
4) Недахопаў не было – многа хібаў.

A20. Адзначце, пры дапамозе якіх сродкаў звязаны 2 і 3 сказы тэксту:

Ефрасіння Полацкая – святая апякунка і першаасветніца нашага народа. Усё жыццё яна прысвяціла служэнню Богу і людзям. Яна перапісвала старадаўнія кнігі, вучыла грамаце дзяцей. А яшчэ будавала храмы. Адзін з іх – Спаса-Ефрасіннеўская царква, якая і па сённяшні дзень стаіць у Полацку.

1) злучнік;
2) сінонімы;
3) займеннік;
4) лексічны паўтор;
5) няпоўны сказ.